**ВОДЗЫЎ**

навуковага кіраўніка

аб дысертацыі Селях Аксаны Аляксандраўны

**"ТРАНСФАРМАЦЫЯ ПАЎСЯДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ БЕЛАРУСКІХ СЕЛЬСКІХ ДЗЯЎЧАТ У ЗАХОДНІМ ПАЛЕССІ Ў 20–80-Я ГГ. ХХ СТ.",**

прадстаўленай на саіскание вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

Падрыхтаваная А.А. Селях дысертацыя ўяўляе сабой новае і арыгінальнае ў айчыннай этналагічнай навуцы даследаванне. Яно з'яўляецца значным для разумення дынамікі этнакультурных працэсаў, што адбываліся ў Заходнім Палессі ў разгледжаны храналагічны перыяд, праз асэнсаванне спецыфікі трансфармацыі паўсядзённага жыцця асобнай этнічнай, сацыяльнай, полаўзроставай, статуснай групы – беларускіх сельскіх дзяўчат.

Абраная даследчыцай для навуковага асэнсавання праблема адрозніваецца адметнай актуальнасцю, складанасцю, нераспрацаванасцю і перспектыўнасцю. У дысертацыі разглядаецца не проста паўсядзённае жыццё дзяўчыны ў заходнепалескім соцыуме, а паказана яго трансфармацыя, што адбывалася пад уплывам шэрагу фактараў: гістарычных, палітычных, сацыякультурных. Этналагічны падыход, які ўдала ажыццявіла А.А. Селях, адрозніваецца ад чыста гістарычнага падыходу. Гісторыкі таксама вывучаюць гісторыю паўсядзённасці, але вывучаюць яны яе праз падзеі, праз даты. А этналагічны, антрапалагічны падыход разглядае штодзённасць як з'яву, якая знаходзіцца ў пастаянным развіцці. Адпаведна, зыходзячы з гэтага пункту гледжання, акрэсліць строгую перыядызацыю трансфармацыйных працэсаў – гэта звузіць саму праблему паўсядзённасці. Любая з'ява, якую вывучае этнолаг, у адрозненне ад чыстага гісторыка, павінна быць паказана ў развіцці.

Варта звярнуць увагу на тое, які значны ўклад гэта работа ўносіць у гуманітарную навуку ў цэлым і ў этналагічную навуку ў прыватнасці. Па-першае, гэта рэгіянальнае даследаванне. На багатым факталагічным матэрыяле, сабраным асабіста аўтарам, паказана культурная спецыфіка гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Заходняе Палессе. Па-другое, вылучана частка вясковага соцыўму, якая з'яўляецца самай яркай, прадстаўнічай, – дзяўчаты. Селях А.А. не проста паказала жыццё гэтай групы вясковага насельніцтва ў сям'і, у грамадстве, а ажыццявіла складанейшы навуковы падыход, накіраваны на паказ спецыфікі трансфармацыі паўсядзённага жыцця.

Scanned with CamScanner

Асобнай увагі заслугоўваюць крыніцы, якія былі выкарыстаны. Фундаментам дысертацыі стаў багаты факталагічны матэрыял, сабраны аўтарам у выніку палявых этнаграфічных даследаванняў. Акрамя таго, выкарыстоўваліся архіўныя крыніцы (як Нацыянальнага архіву Рэспублікі Беларусь, так і шэрагу рэгіянальных архіваў), апублікаваныя матэрыялы беларускіх этнолагаў і фалькларыстаў і нават музейныя калекцыі (УК "Мотальскі музей народнай творчасці", УК "Музей Беларускага Палесся", УК "Кобрынскі ваенна-гістарычны музей імя А.В. Суворава"), на падставе якіх удалося прасачыць трансфармацыю паўсядзённага жыцця заходнепалескай дзяўчыны.

Вынікі і матэрыялы дысертацыі маюць заўважны практыкаарыентаваны характар. Распрацаваны А.А. Селях апытальны ліст уключаны ў метадычныя рэкамендацыі для навучальных студэнцкіх гісторыка-краязнаўчай і археолага-этнаграфічнай практык на гістарычным факультэце УА "Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна". Матэрыялы актыўна выкарыстоўваюцца ў навучальным працэсе вышэйшай школы. У перспектыве матэрыялы даследавання могуць выкарыстоўвацца ў музейнай сферы, супрацоўнікамі турыстычнай сферы.

Работа прайшла шырокую апрабацыю (удзел у міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных канферэнцыях). А.А. Селях актыўна публікавалася ў Брэсце, Гомелі, Полацку, у сталічных важнейшых навуковых часопісах і выданнях. Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання адлюстраваны ў 36 навуковых работах, з іх 8 – артыкулы, уключаныя ў пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў, 9 – артыкулы ў зборніках навуковых работ, 17 – артыкулы ў зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый, 2 – тэзісы.

Атрыманыя дысертанткай вынікі сведчаць пра ўдалае якаснае авалоданне тэарэтычнымі напрацоўкамі айчынных і замежных даследчыкаў, а таксама навыкамі палявой этнаграфічнай работы.

Падрыхтавана высокакваліфікаваная работа, якая выканана ў адпаведнасці з усімі патрабаваннямі ВАК і заслугоўвае прысуджэння навуковай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія, і антрапалогія *за дасягненне новых навуковых вынікаў, якія маюць вялікую значнасць для этналогіі Беларусі*:

- выяўленне спецыфікі трансфармацыйных працэсаў у паўсядзённым жыцці беларускіх сельскіх дзяўчат Заходняга Палесся ў 1920–1980-я гг.;

Scanned with CamScanner

- увядзенне ў навуковы ўжытак новых палявых матэрыялаў, якія ў значнай ступені ўзбагацілі нашы веды і ўяўленні пра паўсядзённасць заходнепалескай вясковай супольнасці;

- этналагічнае асэнсаванне паняццяў "дзяўчына", "дзявочае паўсядзённасць", "трансфармацыя дзявочай паўсядзённасці";

- за глыбокі аналіз статусных і ролевых пазіцый сельскіх дзяўчат;

- раскрыццё асаблівасцей заходнепалескай народнай культуры з пункту гледжання полаўзроставай і статуснай стратыфікацый, якія з'яўляліся адным са значных фактараў арганізацыі і дыферэнцыяцыі паўсядзённага жыцця.

Навуковы кіраўнік:
доктар гістарычных навук, прафесар,
прафесар кафедры этналогіі,
музеялогіі і гісторыі мастацтваў
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Т.А. Навагродскі

ПОДПИСЬ Навагродскага УДОСТОВЕРЯЮ
Зам. начальника управления
организационного и
документационного обеспечения
Е.И. Зинкевич
27 . 04 2026 г.